**Чароўны квадрат "З любоўю да роднага слова"**

**Мэта:**- садзейнічаць пашырэнню ведаў вуняў пра родную беларускую мову;
- фарміраваць уменне канструяваць словы і правільна іх вымаўляць;
- садзейнічаць развіццю лагічнага мысленя, памяці, кемлівасці;
- выхоўваць узаемадапамогу, сяброўства, калектывізм.

**Ход мерапрыемства**

-Добры дзень,дзеці!Сёння да нас на мерапрыемства павінна была прыйсці беларуская мова,але яе схапілі злыя людзі. Яны кажуць, што нам, беларусам , не патрэбна мова, і мы яе не ведаем. І зараз лёс нашай мовы залежыць ад вас, мае сябры. Дапаможам мове? Дык вось, на дошцы вы бачыце звычайны, на першы погляд, квадрат, але гэта не так. Наш квадрат –чароўны, ён складаецца з 9 маленькіх квадрацікаў, у якіх змешчаны розныя заданні. Вы павінны выканаць іх і даказаць людзям, што мы, беларусы, любім і ведаем сваю мову. Вы згодны са мной? Так.Тады пачнем.

(Вучань выходзіць да дошкі і выцягвае любы квадрацік).

**1 квадрацік. Гульня "Назаві адным словам"** (тром відавым паняццям дзеці знаходзяць агульнае радавое).

-Пчала,жук,чмель…

-Верабей, ластаўка, сарока…

-Заяц, воўк, ліса…

-Званочак, рамонак, васілёк…

-Сукенка, хустка,шапка…

Добра,вельмі добра!

**2 квадрацік. Гульня "Жывы –не жывы"**

(Настаўнік называе слова.Калі яно абазначае жывую істоту, дзеці імітуюць яе рухі, калі нежывую-спакойна стаяць. Вучань, які памыліўся , прысядзе каля парты).

Казуля-кашуля, лыжка-мышка, дошка-кошка, крот-рот, жабка-шапка, ножык –вожык, рак-мак, качка-тачка.

**3 квадрацік. "Домік".** "Сарвіце" галосныя з дрэва і ўстаўце ў акенца доміка.



**Літары –о,ы,у,і,а,у.**

| | | |
|---|---|---|
| **С** | | |
| **С** | | |
| **С** | | |
| **С** | | |
| **С** | | |
| **С** | | |

**4 квадрацік. Гульня “Наадварот”** праводзіцца з мячом.

-Я кідаю мяч і называю слова. Вучань, у якога мяч , павінны назваць слова з супрацьлеглым значэннем.

Дзень-
Ранак-
Зіма-
Чысты-
Мяккі-
Ідзе-
Часта-
Высока-
Сумна-
Згубіў-
Цяжка-
Шырокі-
Цёмна-
Глыбока-
Справа-

**5 квадрацік.** Ну , а гэты квадрацік прапаноўвае вам красворд **“Школьны дыктант”**

1.Люстэрка вучня.
2.Прыналежнасць для пісьма.
3.Самы першы падручнік.
4.Мэбля ў класе.
5.Школьная сумка.
6.Доўгачаканая мелодыя,якая сведчыць аб заканчэнні ўрока.
7.Чалавек, які дае веды.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **д** | з | ё | н | н | і | К |
| | с | ш | **ы** | т | а | к | | | |
| | б | у | **к** | в | а | р | | | |
| п | а | р | **т** | а | | | | | |
| | | р | **а** | н | е | ц | | | |
| з | в | а | **н** | о | к | | | | |
| н | а | с | **т** | а | ў | н | і | к | |

**6 квадрацік. “Рэбусны”**

Вучням прапаноўваецца разгадаць рэбусы:

1. Т = П

3 + 5 = ? (Прыпяць)

2. РЫРЫ (двары).

3. АЧ (Нарач).

Р

**7 квадрацік. “Адгадайка”**

У словазлучэні “Родная мова” схавана шмат іншых слоў. А якіх? Гэта вы мне зараз і скажаце.( Дзеці з літар словазлучэня складаюць словы. Падводзяцца вынікі.).

**“Пошта”**

З кожнай літары слова “свая” трэба ўтварыць слова. З атрыманых слоў скласці тэкст тэлеграмы. (Напрыклад.Слівы вашы абтрос я).

**8 квадрацік. “Чароўная кветка”**



У кветцы зашыфравана прозвішча выдатнага беларускага паэта . (Багдановіч).

-Што вы ведаеце пра яго?

**9 квадрацік. “ Адгадай загадкі”**

Ноччу маўчыць, удзень гамоніць, маці другая — дзяцей навучае. (Школа)

Не куст, а з лісточкамі, не рубашка, а сшыта, не чалавек, а расказвае. (Кніга.)

Без крылаў, а ляціць, без языка, а гаворыць. (Пісьмо.)

Ляжыць палена, а ў сярэдзіне сэрца. (Аловак.)

Крылаў не маю, а хутка лятаю, сам мяне выпусціш, ды потым не зловіш. (Слова.)

З выгляду — мячык на восі стаячай, а сіла такая — усю зямлю трымае. (Глобус.)

У лесе сцята, у краме ўзята, на руках плача. (Скрыпка.)

Увесь свой век ходзіць, а з месца не сходзіць. (Гадзіннік.)

Яго б'юць, а ён не плача. (Мяч.)

Языка не мае, а гаворыць і спявае. (Радыё.)

У адным клубочку ды сем дзірачак. (Галава.)
Поўны хлявец белых авец, а між тых авец баранец. (Зубы і язык.)
Адзін гаворыць, двое глядзяць, двое слухаюць. (Язык, вочы, вушы.)
Між двух свяціл я пасярэдзіне адзін. (Нос.)
Пяць братоў у адну ноч радзіліся, а ростам не роўныя. (Пальцы.)
Ні рук, ні ног не мае, а яблыкі страсае. (Вецер.)
З неба крупы падаюць. (Град)
Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае. (Раса.)
Хоць зубоў не мае, а балюча кусае. (Мароз.)
З неба ўпаў — усю зямлю, як абрусам, заслаў. (Снег.)
Са страхі морква вісіць, да зямлі не дастае, паху не мае, зімой вырастае. (Лядзяш.)
Як гукнецца, так і адзавецца. (Рэха.)
Стаіць дом на дванаццаць вакон, пад тымі вокнамі па чатыры паны, а ў тых паноў
па сем вянкоў. (Год, месяц, тыдні, дні.)
Шэрае сукно лезе ў акно. (Світанак.)
Устаў белы бык, у акно пальчык тык. (Дзень.)
Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці. (Ноч.)
На паляне сіняй пасецца конік сівы. (Ноч і месяц.)
У сінім мяшочку шмат белых парасят. (Неба і зоркі.)
Усіх нас корміць, сама есці не просіць. (Зямля.)
Без ног бяжыць. (Вада.)
Тры таварышы: адзін кажа — пабяжым, другі кажа — паляжым, трэці кажа — паківаемся.
(Вада, камень, трава.)
Два браты глядзяць у ваду, а ніколі не сыходзяцца. (Берагі рэчкі.)
Стукае, грукае і нідзе яго не відаць. (Гром.)
Хоць ён побач ідзе, а рукамі не возьмеш. (Цень.)
На вадзе родзіцца, а вады баіцца. (Лёд.)
Рук многа, а нага адна. (Дрэва.)

**Вынік мерапрыемства**

-Малайцы! Вы адказалі на ўсе пытанні і выканалі ўсе заданні. Наша мова зноў з намі. І сёння я заклікаю вас: “ Беражыце сваю мову, шануйце яе, таму што, як сказаў беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч, - “хто забыў сваіх продкаў - сябе губляе, - хто забыў сваю мову - усё згубіў”.